**Дарафеенка Н.І.**

# АБ ВЕРЫ ХАРУЖАЙ – НОВАЕ СЛОВА

Аб Веры Харужай напісана нямала кніг, артыкулаў, успамінаў, вершаў і нават песняў. Неаднаразова друкаваліся яе пісьмы розных гадоў. Беларускі народ ведае сваю гераіню. А вось невялічкі, гераічна-трагічны кавалачак яе ваеннай біяграфіі, звязаны з Віцебскам, даследаваны даволі павярхоўна. З публікацыі ў публікацыю пераходзілі адны і тыя ж звесткі аб яе сувязі з сям'ёй Вараб'ёвых і Антонавых. Гэты артыкул перш за ўсё накіраваны супраць тых дамарошчаных фальсіфікатараў, якія замест далейшых сур'ёзных даследаванняў, асабліва ў 1992 – 1993 гг., узяліся распускаць чуткі аб тым, што Харужая нічога не змагла зрабіць за час сваёй кароткай дзейнасці ў падполлі Віцебска. Або вось апошні прыклад. У гарадской газеце «Віцьбічы» ад 6 кастрычніка 1998 года з'явіўся невялікі артыкул, прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння Харужай. Гэта прыемна. Але з-за недасведчанасці журналіста ў ім дапушчана памылак і недакладнасцяў больш, чым радкоў у артыкуле. Па-другое. Да гэтага часу не развеяліся сумненні наконт прычыны гібелі Харужай і яе сяброў па падполлі. Дзве гэтыя праблемы і будуць разгледжаны ў гэтай рабоце.

З Масквы Вера Захараўна Харужая выехала 24 жніўня 1942 года і прыбыла ў прыфрантавую паласу да Віцебскіх (Суражскіх) «варот», дзе размяшчалася штаб-кватэра Віцебскага падпольнага абкама партыі (першы сакратар Іван Андрэевіч Стулаў) і абласная аператыўна-чэкісцкая група (кіраўнік Сямён Васільевіч Юрын – «Васільеў»). На іх Вера ўскладала вялікія надзеі. Яна так і пісала: «*Теперь все зависит от Стулова и Юрина. Думаю, что и за ними дело не станет, и мы скоро будем на месте*».

Група Хружай размясцілася ў навакольных вёсках, а больш дакладна – іх перакідвалі з адной вёскі ў другую (Шэйно, Даўгавіцы, Ківалы, Пудаць і інш.). У складзе групы было 18 жанчын рознага ўзросту, рознага сацыяльнага паходжання, розных нацыянальнасцяў. Сярод іх было 10 камуністаў, 6 камсамольцаў і двое беспартыйных. Большая частка групы прайшла асабістую падрыхтоўку або ў спецшколах. Віцебск добра ведала толькі Еўдакія Савічна Суранава. У пералічаных вёсках, а часцей у навакольным лесе, далей ад цікаўных вачэй, працягвалася падрыхтоўка: вывучаўся план Віцебска, падыходы да яго, сродкі сувязі, шыфры. Гутарку з дзяўчатамі праводзіў вопытны падпольшчык Сяргей Осіпавіч Прытыцкі, перадавалі свой багаты вопыт падпольнай работы Харужая і Соф'я Сяргееўна Панкова. Шмат увагі ўдзяляла Вера згуртаванню групы, гатоўнасці да ўзаемавыручкі, вучыла маўчаць, назіраць, запамінаць. Як адзначаюць відавочцы, амаль кожны дзень на працягу месяца па некалькі гадзін Харужая працавала з Юрыным, распрацоўваючы «легенду», рыхтуючы дакументы. Рэдактар

падпольнай газеты «Віцебскі рабочы» В.Е. Самуцін гаварыў, што нягледзячы на тое, што гэтыя два чалавекі падоўгу працавалі разам, згоды ў іх не было, часта спрачаліся, нават даводзілася іх мірыць.

20 верасня 1942 года праз «вароты» Вера Харужая, Тоня Ермаковіч (па мужы Узкая) і Дуся Суранава ў суправаджэнні адказнага арганізатара абкама КП(б)Б па горадзе Віцебску Васіля Раманавіча Кудзінава, ступілі на партызанскую зямлю ў размяшчэнне атрада М.Ф. Біруліна, 1-й Беларускай партызанскай брыгады.

У якасці ж каго і з якімі паўнамоцтвамі накіроўвалася Харужая ў Віцебск і чаму менавіта ў Віцебск?

У спісах партработнікаў, накіраваных у тыл ворага, пад нумарам 27 лічыцца Харужая. Супраць яе прозвішча пазначана: «*Включить в состав подпольного партийного центра в Витебске*». Сакратар ЦК КП(б)Б Рыгор Барысавіч Эйдзінаў удакладніў: «*Хоружая – революционерка высшего класса и направлялась в Витебск как эмиссар ЦК Белоруссии с очень широкими полномочиями... Это выше, чем секретарь горкома партии*». Накіраванне такой вопытнай падпольшчыцы ў Віцебск тлумачыцца, у першую чаргу, яго ваенна-стратэгічным значэннем для абодвух ваюючых бакоў. Горад уяўляў з сябе буйны транспартны вузел на адказным напрамку ваенных дзеянняў. Пасля бітвы пад Масквой і контрнаступлення нашых войск, Віцебск стаў прыфрантавым горадам, увайшоў у зону армейскага тылу, быў насычаны варожымі войскамі, разведвальнымі і контрразведвальнымі органамі, тут размясцілася мноства штабоў, рамонтных майстэрняў, складоў, шпіталяў, сюды адводзіліся на перафарміраванне разбітыя франтавыя часці.

З другога боку, да канца 1942 года Віцебск стаў горадам выключна вострай унутранай барацьбы, ужо дзейнічала 56 падпольных груп, было закінута нямала нашых армейскіх разведчыкаў, нават з радыёстанцыяй. Горад літаральна кішэў разведчыкамі з абодвух бакоў. Вера адразу ацаніла работу сваіх папярэднікаў і прызнала, што «... *почва для работы подготовлена прекрасно*». Аднак бяда была ў тым, што і падпольны партыйны цэнтр, зацверджаны абкамам КП(б)Б у 1941 годзе яшчэ да акупацыі Віцебска, не запрацаваў, яго кіраўнікі Іваноў і Папоў самавольна пакінулі горад. Адказны арганізатар абкама партыі па горадзе Віцебску Кудзінаў знаходзіўся ў размяшчэнні партызан і кіраваў падполлем з дапамогай сувязных. Падпольны ж гаркам КП(б)Б быў створаны толькі 7 красавіка 1943 года і заставаўся ўвесь час у партызанскай зоне. Зразумела, што падпольныя групы горада вымушаны былі ўстанаўліваць сувязі па-за горадам, як каму ўдавалася: з армейскімі і аперчэкісцкімі групамі, партызанскімі фарміраваннямі, з Кудзінавым, як прадстаўніком партыйных органаў, камсамольскімі работнікамі. У выніку разведінфармацыя паступала з горада

разрозненнай, не давала цэльнага ўяўлення аб становішчы ў горадзе. Абстаноўка настойліва патрабавала стварэння адзінага кіруючага цэнтра непасрэдна ў Віцебску. Зрабіць гэта павінна была Вера Харужая.

27 верасня 1942 года партызанская сувязная Клаўдзія Дзямідаўна Балдачова (“Бяроза”) прывяла ў Віцебск на вуліцу Трактарную, 4а да Вараб'ёвых Дусю Суранаву і Антаніну Піліпаўну Ермаковіч. Першыя сувязі пасланцоў Харужай былі ўстаноўлены з падпольнай групай А.І. Ліпці, якая паспяхова дзейнічала ў пральні, размешчанай у цэнтры горада, з сям’ёй Марыі Ільінічны Мацэнка, якая пазней стала інструктарам абкама партыі па Віцебску, сёстрамі Ефрасінняй і Аляксандрай Волат, якія да гэтага выконвалі заданні армейскага разведчыка П.С. Татарынава. Яны азнаёміліся з абстаноўкай.

1 кастрычніка ў суправаджэнні Тоні Ермаковіч, якая прыступіла да выканання ролі сувязной, у Віцебск прыбыла Вера Харужая. Зноў да Вараб’ёвых. Аб гэтай сям’і ў пасляваеннай літаратуры, прысвечанай Харужай, сказана шмат добрых і заслужаных слоў, асабліва аб гаспадыні дома Марыі Ігнацьеўне («Бабуля Маша»). Яе сын Васіль Сямёнавіч працаваў на хлебазаводзе і стаў адным з найбольш актыўных памочнікаў Веры, як і яго жонка Агаф’я Максімаўна. Вараб’ёвы даводзіліся сваякамі Дусі Суранавай і прыхільна сустрэлі пасланцоў Вялікай зямлі.

Яшчэ па дарозе Вера зразумела, што іх дакументы зроблены дрэнна і карыстацца імі небяспечна, а абстаноўка ў горадзе аказалася значна больш складанай, чым бачылася тым, хто іх накіраваў. Ужо ў першых сваіх пісьмах Вера паведамляла: «*Обстановка очень сложная*», «*В общем все интересно... только несколько труднее*». Сярод 104-х (з другіх крыніц – 118) адрасоў, якія меліся ў Харужай, аказалася «*много пустых мест*». Патрабавалася дасканалая праверка.

Удзвюх з Суранавай Харужая ўпарта і нястомна рабілі тое, што павінна была рабіць вялікая і добра падрыхтаваная яе група. Іх агульныя намаганні і вопыт Веры дапамаглі за кароткі час падабраць па-сапраўднаму каштоўных памочнікаў сярод нашых землякоў. Не выпадкова, у пісьмах Веры часта сустракаюцца выразы: «*Хороших людей много*», «*Это чудесные люди*» і г.д.

25 кастрычніка Харужая паведамляла, што ў іх на сувязі ўжо ёсць да 20 чалавек. А калі ўлічыць, што сярод гэтых дваццаці былі і кіраўнікі падпольных груп, то агульная лічба будзе ў некалькі разоў большая. Толькі група «Радзіма», што дзейнічала на чыгунцы, налічвала да 30 чалавек, якія, згодна з паведамленнем Веры, «*кое-что делают*». Вельмі важна было тое, што ўдалося ўстанавіць кантакт з разведчыцай армейскай групы Вольгай Пінчук. Аднойчы з яе дапамогай Вера пераправіла сваё пісьмо.

У сям’і Мацэнкі адбылося вельмі каштоўнае знаёмства з мясцовай жыхаркай, латышкай па нацыянальнасці, якая добра ведала нямецкую мову

і мела надзейныя дакументы – камуніcткай Марыяй Іванаўнай Гульбе. Дзень за днем Гульбе хадзіла па горадзе, заходзіла ў розныя ўстановы, да знаёмых, асабліва да тых, што працавалі ў акупацыйным апараце. А вечарамі Гульбе і Вера падоўгу гутарылі ў падвале дома па 2-й Ветранай (цяпер Грыбаедава, 14), дзе юцілася сям'я Мацэнкі, яе маці і брат. Брат інфармаваў Веру аб становішчы на чыгунцы, дзе працаваў.

Разведчыц вельмі цікавіў аэрадром, размешчаны амаль у цэнтры горада. Таму сапраўднай знаходкай для Веры аказалася сціплая краўчыха-інвалід, член падпольнай групы К.С. Акаловіч Матрона Кліменцьеўна Оскер. Непрыкметны яе домік непадалёк ад аэрадрома (5-я Вінчэўскага, 16) стаў явачнай кватэрай, дзе Вера сустракалася з многімі людзьмі. Тут адбылася і тая таямнічая сустрэча з «нявестай партызана Германовіча», аб якой пісалі многія даследчыкі, але не ведалі з кім і дзе яна праходзіла. «Нявестай» аказалася камсамолка Зінаіда Аляксандраўна Шаракова (Мацвіевіч), якая працавала на аэрадроме. Пасля сустрэчы з «цёцяй Аняй» (так адрэкамендавалася Харужая) кожны дзень напрацягу месяца пасля работы Зіна падрабязна інфармавала Оскер аб аэрадроме. Вера пазнаёмілася і з групай ваеннапалонных, якія працавалі на аэрадроме, а таксама з некаторымі членамі групы К.С. Акаловіч.

Яшчэ ў партызанскай зоне Кудзінаў пазнаеміў Веру з кіраўніком баявой дыверсійнай групы Мікалаем Якаўлевічам Нагібавым («Смелы»). Вера неаднаразова ўпамінае аб ім у пісьмах. На жаль, многія сувязі Харужай у віцебскім падполлі застаюцца не расшыфраваныя: хто такія Азолавы, аб якіх яна ўпамінае двойчы, хто такая «Зорачка», якую Вера не знайшла, але сувязі яе не кранала, невядома да каго хадзіла Вера і сувязная на Пясчаную, 25. Засталіся ў пісьмах Харужай і іншыя неразгаданыя сакрэты. Нягледзячы ні на што Харужай і Суранавай удалося ўстанавіць сувязі з многімі падпольнымі групамі, прыцягнуць да работы новых людзей. Вера накіроўвала дзейнасць падполля, нават экзаменавала, рабіла ўсё, каб павысіць «кваліфікацыю» падпольшчыкаў. Вера дзейнічала згодна з заданнем і ёй удалося займець сваіх людзей на важнейшых аб'ектах ворага, атрымліваць разведінфармацыю амаль з усіх куткоў горада: аэрадрома, чыгункі, радыёвузла, хлебазавода, управы, раёна Пескаваціка і др. Такім чынам, упершыню непасрэдна ў горадзе, дзе на кожных восем жыхароў у той час прыходзіўся адзін узброены акупант ці яго памагаты, запрацаваў кіруючы партыйны цэнтр. Ён дзейнічаў з 27 верасня да 13 лістапада 1942 года. Назва ж «група Харужай» адносіцца толькі да той групы жанчын, што прыбылі з Верай з Масквы. У Віцебску з Харужай працавала толькі Дуся Суранава, сем разоў у якасці сувязной пабывала тут Тоня Ермаковіч, Соф'я Панкова арыштавана ў дзень прыходу, а Ганна Іванькова пасылалася толькі для высвятлення прычын маўчання Веры. Яна

першая прынесла вестку аб арышце Веры і яе таварышаў. Астатнія члены групы ў Віцебску не былі.

Аб тым, што партыйны цэнтр працаваў эфектыўна, сведчыць ацэнка яго дзейнасці сакратаром ЦК КП(б)Б Эйдзінавым: «*Для действий фронтовой авиации она* (Харужая – *аўт.*) *дала больше, чем за многое время до нее. Ее информация поступала сразу же в штаб армии, штаб фронта, в ЦК. Шифровки могут быть у Кудинова*».

Такая ацэнка кампетэнтнага кіраўніка, а таксама выкладзеныя вышэй факты, будуць абвяржэннем вымыслаў розных фальсіфікатараў і недасведчаных журналістаў. Гаварыць і пісаць трэба не аб тым, што не зрабіла Вера і яе таварышы, а здзіўляцца таму, як яна ў самых неспрыяльных, небяспечных умовах магла столькі зрабіць.

13 лістапада 1942 года на кватэры Вараб'ёвых былі арыштаваны Вера Харужая (па дакументах Ганна Карнілава), Соф'я Панкова (Антаніна Заско), Дуся Суранава (Марыя Пятроўская), Клава Балдачова («Бяроза»), Васіль Вараб'ёў, Марыя Вараб'ёва («Бабуля Маша»), дзве яе нявесткі Агаф'я Вараб'ёва і Ганна Васільева.

18 лістапада ўсе арыштаваныя былі перададзены з гарадской турмы ў СД і ўтрымліваліся ў падвалах на Успенскай горцы (зараз філіял абласнога краязнаўчага музея). Пасля першага допыту Харужую і Панкову ізалявалі ад астатніх. Нягледзячы на страшэнныя пакуты, бесперапынныя допыты і катаванні, ніхто не выдаў сваіх таварышаў па падполлі, таму ніводнага чалавека больш не арыштавалі. Толькі Ганна Васільева не вытрымала і назвала сапраўднае імя Харужай, дала згоду супрацоўнічаць з ворагам. За што пазней і панесла пакаранне.

Гаворачы пра аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны такога хуткага правалу, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што былі і тыя, і другія, але пераважалі прычыны суб'ектыўныя. Звернемся да пісьмаў Веры Захараўны аб матэрыяльнай падтрымцы групы. У пісьме ад 11 кастрычніка Вера пісала на імя Кудзінава: «*На сегодняшний день главная трудность состоит в нашей личной неустроенности, но уже есть надежда. Нужны деньги... Во что бы то ни стало пришли денег*». 25 кастрычніка ўжо больш катэгарычна: «*У нас вовсе нет денег, если завтра не пришлешь, придется продавать часы. ...Нельзя пока одолжить советских и прислать?*»

А цяпер будзем уважлівыя. Удалося пазнаёміцца з пяццю рознымі варыянтамі надрукаваных і ненадрукаваных пісьмаў Харужай. У ненадрукаваным варыянце гэтага пісьма напісана крыху інакш: «*... надо иначе получить мои деньги и вызвать девчат. Пока одолжи советские и пришли*».

Розніца невялікая, але вельмі істотная. Тут ёсць словы «*мои деньги*», якія падкрэсліваюць, што для групы Харужай існавалі спецыяльна прызначаныя грошы. Вядома, што не толькі грошы, а і іншыя каштоўнасці. Па дарозе з Масквы яны захоўваліся ў Панковай.

Член групы Л.В. Даброціна бачыла іх і гаварыла Тоні Ермаковіч: «*Куда же все это девалось, ведь столько было*».

Адказ на гэтае пытанне знаходзім у дакладных Кудзінава, напісаных ужо пасля гібелі Харужай: «*При отьезде из обкома, Вера не взяла с собой ни советских, ни немецких денег, т.к. она все ценности сдала тов. Стулову, а последнего в то время не было в обкоме*», «*Ценности остались у Стулова. На мои запросы деньги я получил только 18 ноября ... Жизнь на нелегальном положении, при частой смене квартир, требовала денег*». Чаму ж так недаравальна спазніліся?

А тым часам Вера і Дуся галадалі. Дуся саромелася есці ў сваіх родзічаў Вараб'ёвых, вельмі чакала грошай. Абедзве яны былі кепска апрануты. Прыкладна такія ж адносіны былі і да астатніх членаў групы. Панкова, якая засталася замест Веры, просіць Эйдзінава: «*Хотелось бы встретиться лично ... Сидим почти голодные, кроме хлеба почти ничего нет... У всех товарищей сложилось очень скверное впечатление – мы никому не нужны, поэтому нами так бросаются. У всех одно и то же: пусть нас расформируют и пошлют скорее в дело...*» Нічога не змянілася. Вера загінула, група была раскідана.

Аб дакументах. Многія адказныя асобы займаліся пытаннямі падрыхтоўкі дакументаў для групы Харужай. Ішла інтэнсіўная перапіска. У адной з запісак Вера пералічыла ўсе, што ёй можа спатрэбіцца ў падполлі і прасіла прыслаць да яе людзей з дакументамі, згодна з яе парадамі. Эйдзінаў дае ўказанне загадчыку аргінструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б Закурдаеву (даты няма): «... *Посылаю два витебских паспорта. Они дают представление, как оформлять паспорта для Витебска. Образец нового вкладыша есть в Москве з Управлении Погранвойск. Надо очень быстро переоформить паспорт*».

Перапіска засталася для гісторыі, а справы былі зусім іншыя. Пашпарты не перааформілі ні для Веры, ні пазней для астатняй групы. А Вера ўвесь час прасіла і напамінала: «*С нашими документами жить невозможно*», «*С нашими документами нельзя ни прописаться, ни устроиться на работу. Можно жить только у очень хороших людей, готовых из-за тебя жертвовать жизнью и семьей*», «*Может «Сидоров» возьмется прописать наши паспорта?*» Наўмысна ці па безадказнасці, але зноў спазніліся. Сувязная да «Сідарава» была паслана тады, калі не вярнулася ад Веры сувязная Балдачова, і стала зразумелым, што з Верай штосьці здарылася. Стары чэкіст Е.І. Хмялёў («Сідараў») працаваў у жыллёвай канторы і ўжо прапісаў армейскую разведчыцу Шуру Вінаградаву. Згадзіўся дапамагчы і Веры. Але было позна. Ва ўсіх гэтых падзеях зусім у баку засталіся чэкісты, у прыватнасці, Юрын. Як піша Кудзінаў, яны лічылі «*что это дело не ихнее и нечего впутываться*». Іх дапамога абмежавалася інфармацыяй аб Віцебску і быў пастаўлены нейкі штамп у дакументах.

Ёсць яшчэ адна запіска Веры, якая не мае дачынення да дакументаў, але дапаўняе ўжо сказанае і сведчыць аб тым, што нечаканасці пачаліся яшчэ з Масквы. Вось гэтая запіска ад 28 жніўня 1942 года: «*Уважаемый товарищ Эйдинов! Наш техник-радист тов. Николаев беспокоится, что ему пришлют вместо Асановской радистку из другой организации, с которой у него не будет согласовано все как надо... Прошу Вас горячо и убедительно дать крепкую взбучку тому, кто забрал у нас Асановскую и даже не поставил ЦК в известность... Распорядитесь, чтобы незамедлительно была дана новая радистка... У нас все в порядке, мы готовы к действию*». Рацыі ў Веры не было. Ужо арыштаванай Веры Кудзінаў паведамляў: «*Сегодня в обком. Привезу рацию*». І сапраўды 26 лістапада, у самы цяжкі час для Харужай і ўсіх арыштаваных, Кудзінаў на цэлы месяц выехаў у абкам партыі. Чаму, маючы грошы і каштоўнасці, не паспрабавалі выкупіць каго-небудзь з арыштаваных?

Аператыўна сталі вырашацца толькі тыя пытанні, якія ўжо бессэнсоўна было вырашаць. Што гэта? Простая абыякавасць, нядобрасумленнасць, перастрахоўка або злачыннасць?

4 снежня 1942 года, узятыя з розных камер у 6 гадзін раніцы, Вера Харужая, Дуся Суранава, Клава Балдачова (Шадурская) і трое Вараб'ёвых былі расстраляны. Дзе? У лагеры ваеннапалонных на тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка. Чаму там? Па вельмі простай прычыне. Кожны дзень у лагеры памірала шмат людзей і ўвесь час былі адкрытымі свежавыкапаныя ямы, у любую хвіліну гатовыя прыняць новыя ахвяры.

Зусім выпадкова знайшлася сведка апошніх гадзін жыцця Веры – Ганна Сцяпанаўна Кіташова, віцебская падпольшчыца, якая 3-га снежня 1942 года была кінута ў падвалы СД, у камеру біткам набітую арыштаванымі. Гарэла тусклая лямпачка, месца свабоднага не было. Кіташова прысела на край парашы. Малады хлопец, які сядзеў непадалёку, каб неяк падтрымаць «новенькую», паказаў на жанчыну, якая ляжала на саломе, і сказаў, што з яе трэба браць прыкпад. Усе ў камеры называлі яе «настаўніцай». Яна ляжала спакойна, ні з кім не размаўляла, толькі паціху стагнала, ды прасіла піць. Кроў праступала праз усю вопратку, ногі былі ў сіняках, а твар распух. Побач з «настаўніцай» увесь час знаходзілася жанчына сярэдніх гадоў, як і першая, з чорнымі прамымі валасамі, рэдкімі зубамі, апранутая ва ўсё чорнае. З кансервавай банкі яна паіла «настаўніцу». Так выглядала і была апранута ў дзень арышту Соф'я Панкова. Вопратка ж «настаўніцы» была быццам бы ўзята з гардэроба Харужай.

4 снежня 1942 года ў 6 гадзін раніцы ў камеры з'явіліся гітлераўцы з сабакам, сталі па спісу выклікаць арыштаваных. Сяброўка «настаўніцы» дапамагла ёй падняцца на ногі, а сама кінулася да сцяны, з намерам нацарапаць штосьці. Ці паспела яна напісаць што-небудзь? У гэтую хвіліну гітлеравец дубінкай ударыў «настаўніцу» і сяброўка вярнулася, каб яе

падтрымаць. У канцы таго ж дня вязняў, што заставаліся ў падвале, сагналі ў адно месца сартаваць прывезеную вопратку. Яе было вельмі многа. Кіташова апазнала коўдру і каралі жанчыны, якая сядзела непадалек ад яе з двума невялікімі дзяўчынкамі і увесь час накрывала іх гэтай коудрай. Лёс вывезеных раніцай не пакідаў сумненняў. Харужую і яе сяброў прыняла віцебская зямля. Брат Веры Харужай Васіль Захаравіч сустракаўся з Кіташовай і потым у сваей паштоўцы яшчэ раз пацвердзіў нам, што «настаўніца» і яе сяброўка – гэта Вера Харужая і Соф’я Панкова і не толькі па вопратцы, але і па паводзінах. Так загінулі цудоўныя людзі, палымяныя патрыёты Радзімы. Яны ўсе былі вартыя свайго кіраўніка – Веры Захараўны Харужай. І вось пытанне. А ці магла Вера Харужая пакінуць горад, каб вырашыць усе пытанні, якія маглі б умацаваць іх становішча у горадзе, або зусім пакінуць горад? Прычыны ж для гэтага былі і даволі важкія. Да ўсяго ж Вера мела двух дзяцей, якія ужо страцілі бацьку. Практычна яна магла так паступіць. Ды толькі яна не была б тады Харужай. Справа для Веры Захараўны заўсёды стаяла на першым месцы. Нават калі б абставіны былі ў сто разоў больш цяжкія, Вера засталася б на даручаным ёй баявым пасту.

17 мая 1960 года Вере Захараўне Харужай пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У Віцебску адна з вуліц (былая Трактарная) і СШ № 19 носяць яе імя. У двары сярэдняй школы № 31 устаноўлены бюст В.З. Харужай.

Сёлета споўнілася 83 гады ўнікальнай маладзёжнай арганізацыі – ВЛКСМ. Прыклад Веры Харужай, як «прадукта» камсамола вельмі павучальны для сучасных камсамольскіх, патрыятычных маладзёжных арганізацый. Яе жыццё, дзейнасць – прыклад таго, як трэба любіць сваю Радзіму, свой народ, сваю гісторыю, а ў цяжкую хвіліну – абараняць іх, не шкадуючы свайго жыцця. Вера любіла камсамол, у яе пісьмах розных гадоў шмат узнеслых слоў прысвечана яму.

(Друкуецца па тэксту з часопіса “Политический собеседник” – 2001. – №5(6) са згоды аўтара)